Pierasyłka apłačana ryčałtam

Nr. 47 (640). Wilnia, Niadziela 15 Śniežnia 1935 h. Hod XI (XIX)

БЕЛАРУСКАЯ КРЫНІЦА | BIEŁARUSKAJA KRYNICA

Palityčnaja, hramadzkaja i litaraturnaja hazeta.

Adras Redakcyi i Administracyi: WILNIA, ZAWALNAJA 1—1 (Wilno, Zawalna 1—1). Redakcyja adčyniena ad 9 hadz. ran. da 4-aj uwieč.

HAZETA WYCHODZIĆ RAZ U TYDZIEŃ.

Košty wydawańnia pakrywajuć składki. Składka u hod 4 zał., na paŭhoda — 2 zał., na 3 miesiacy — 1 zał.

З нагоды прысуду ў справе Астроўскі—Луцкевіч

Неахвотна бярэцца за пяро рука. Справа Астроўскі — Луцкевіч прыкрая і наніжаючая беларускі адраджэнска-вызвольны рух. Грамадзкі аднак абавязак змушае нас справай гэтай заняцца.

Луцкевіч і Астроўскі, пасьля разгрому «Грамады», савецкую сваю орыентацыю перамянілі на польскую. Стварылі яны «Цэнтрасаюз» і пайшлі рука ў руку з «Безпартыйным Блёкам Супрацоўніцтва з Урадам». У руках іх на «беларускую працу» апынуліся субсыды, за якія выдавалі газэту і не «за страх, а за совесть» бароліся з беларускім незалежным грамадзянствам. Спачатку йшло ім усё як па масьле. Урэшце — пярун з ясназа неба: пагрызьліся за грошы. Справа апынулася ў грамадзкім судзе. Суд цягнуўся паўтара году. Урэшце 14.XI сёл. г. наступіў прысуд, зложаны з трох пунктаў. Першыя два пункты закідаюць Астроўскаму, што ён арбітральна і хаотычна распараджаўся грашыма і што дэмаралізаваў студэнцкую моладзь, а трэці пункт няцікава характэрызуе аднаго і другога, бо падчырківае факт конфідэнцыянальных (тайных) запамогаў, да якіх былі прычасны аднолькава і Астроўскі і Луцкевіч...

Абодва»гэроі« гэтага несамавітага суду робяць міну здаволеных. Мала таго — супрацоўнікі Астроўскага на сваім сабраньні 18.XI. сёл. («Родны Край» з 26.XI.35) прынялі пастанову, у якой даказваюць, што Астроўскі чысты, як дзявочая сьляза. Тое ж самае робіць і другая старана. Узноў-жа два-тры староньнікі Луцкевіча, на чале з імжа самым, даказваюць, што Луцкевіч чысты як ангел, вось здаецца толькі-б крылцы яму...

Грамадзкая-ж незалежная апінія на гэта ўсё заглядаецца сусім інакш. Апінія гэта ўважае, што працаваць для дабра беларускага народу, бяручы на гэта грошы з „dyspozycyjnych“ сакрэтных сумаў адміністрацыйных уладаў, ніяк ня можна, як з пункту гледжаньня этычнага, так і практычнага. Усякія дыспозыцыйныя сакрэтныя фонды хіба ж не на тое існуюць, каб дапамагаць адраджэньню і вызваленьню народаў? Ды гэта рэч кожнаму ясная і доказы тут сусім лішнія.

Відаць няйнакш гэта ўсё разумелі Луцкевіч і Астроўскі, калі на прасьцярогі грамадзянства з абурэньнем адказвалі, што яны з ніякімі сакрэтнымі сумамі ня маюць нічога супольнага і што яны стопрацэнтныя беларускія незалежнікі.

Пасьля-ж прысуду справа сакрэтных дапамогаў стала цалком яснай і перастала быць сакрэтам. Сяньня ўжо гэтага не пярэчаць Луцкевіч і Астроўскі. Сяньня яны ўжо самі сьцьвярджаюць факт, што грошы яны бралі і што на гэта «мелі поўнае права, бо польскі ўрад і з нашага народу бярэ падаткі», а што віна тут цалком па старане тых, якія ім з сакрэтных сумаў і сакрэтна давалі.

Вось што аб гэтым кажуць староньнікі Астроўскага, у пункце шостым успомненай пастановы: ...«Так званыя сакрэтныя дапамогі беларускім установам ня могуць абцяжваць Астроўскага, бо-ж культурна грамадзкія беларускія арганізацыі маюць роўнае права з падобнымі-ж польскімі арганізацыямі карыстацца з дзяржаўнага скарбу на свае неабходныя патрэбы. Ня віна беларусаў, што польскі ўрад у свае дасюлешнія буджэты ня ўносіў адпаведных пазыцыяў на беларускія культурна-грамадзкія арганізацыі, выдаючы ім дапамогі з дыспозыцыйных сумаў, што ўсім ведама і ні для каго не зьяўляецца сакрэтам»...

Тое-ж самае, толькі іншымі славамі і асьцеражней піша Н. В., асоба больш чым «блізкая» да Луцкевіча, у „Przęglądzie Wileńskim“ з дня 30.XI сёл. г. у артыкуле «Czyści i nieczyści». Чытаем там: „Po rozgromie Hromady i procesie jej przywódców, instytucje kulturalno-oświatowe prohromadowskie zjednoczyły się pod hasłem odseparowania się od niebespiecznej dla ich istnienia polityki i dobijania się niezbędnych dla nich środków materjalnych od państwa polskiego, pobierającego olbrzymie sumy podatkowe od ludności białoruskiej. Instytucje te, uważając, że mają na pomoc państwa całkowite prawo, zerwały z praktyką szukania środków gdzieindziej“.

Вось-жа ўся слабасьць гэткай абароннай аргумэнтацыі Луцкевіча і Астроўскага ў тым, што бралі яны з конфідэнцыяльных урадавых фондаў грошы ня толькі на мэты культурныя, але так-жа і на палітычныя. А якая за гэтакія грошы бывае палітыка і якая з яе можа быць карысьць для беларускага народу, кожнаму ясна. Далей, калі возьмем пад увагу, што польскія адміністрацыйныя ўлады давалі Астроўскаму і Луцкевічу грошы і на беларускія культурныя арганізацыі, але на арганізацыі ад іх толькі залежныя, з сакрэтных фондаў і сакрэтна, мінаючы ўсе іншыя беларускія арганізацыі, і да таго, калі гэтыя даверавыя асобы, як сам факт атрымліваньня грошаў, так і іх расходаваньне старанна скрывалі прад беларускім грамадзянствам, замест хоць-бы ў прэсе рабіць прад ім з гэных сумаў справаздачу, — дык ясна нам стане, што ўся гэта справа, як слушна яе ў трэцім пункце свайго прысуду закваліфікаваў грамадзкі суд, сапраўды нячыстая.

Прысуд гэнага грамадзкага суду для беларускага жыцьця ў Заходняй Беларусі мае дужа важнае значэньне — ён аканчальна выясьніў, якая сапраўды роль Луцкевіча у ягонай пасьляграмадаўскай акцыі на беларускім грунце, эпілёгам якой зьяўляецца грамадзкі суд, каторага ён быў галоўным «гэроем». Цяпер гэта ясна і найбольш наіўным.

Uwahi da prajektu prahramy Bieł. Nar. Abjednańnia

Apublikawany ŭ Nr. 46 „Bieł. Krynicy“ prajekt prahramy dla abnoŭlenaj B.Ch.D. — „B.N.A. zusim adpawiadaje sučasnaści. Ale dziela dapaŭnieńnia prapanuju hetkija papraŭki.

U školnym raździele zusim nie patrebny § 11, u jakim haworycca ab relihii. Relihijnyja sprawy abhaworany asobnym raździełam i heta tam zaznačana.

Apošni parahraf školnaha raździełu prapanuju paprawić hetak:

„B.N.A. za toje, kab u prafesyjanalnych škołach nawučańnie ramiasła było biaspłatnaje, a ŭ zdabywańni siaredniaj i wyšejšaj aświety dzieciam niezamožnych sialan i rabotnikaŭ wyznačalisia stypendyi na košt dziaržawy i samaŭradaŭ“.

U raździele relihijnym prapanuju § 16 paprawić hetak:

„B.N.A. za swabodu isnawańnia relihii, za swabodu relihijnaj dziejnaści i za swabodu wyznawańnia“.

Paśla hetaha parahrafu prapanuju ŭwiaści jašče nowy parahraf:

„B.N.A. praciŭ wykarystywańnia relihii palitykaj“.

Hety apošni parahraf, jak nowy, patrabuje abasnawańnia.

Pałažeńnie relihijnaje ŭ našym Kraju pakazwaje, što wykarystywańnie relihii palitykaj škodnaje nia tolki dla relihii, ale i dla wieručych i ahułam dla narodu. Dyk kudy było-b lepš, kab relihija z świeckaj palitykaj była ŭ raździele. —— J. D—r.

Naahuł prahrama sfarmuławana dobra, i daje mahčymaści da bolš detalnaj raspracoŭki socyjalnych i hramadzkich pytańniaŭ (kali heta budzie patreba) na padstawie punktu „b“ parahr. I, dzie haworycca ab niedapuščeńni „eksplootacyi adnych druhimi“.

Pad hetuju farmuliroŭku možna padwiaści šyrokija socyjalna-ekanamičnyja reformy, jakija buduć patrebny.

Dobra ŭ prajekcie prahramy i toje, što jana nie nehuje tworčaj inicyjatywy hramadzianstwa ŭ kirunku stwareńnia kolektyŭnych formaŭ haspadarawańnia.

Maju na ŭwazie § 19 prajektu i § 23 zredahawanyja zusim jasna i zrazumieła.

Pry ŭsich dadatnich bakoch prajektu prahramy, nielha nie źwiarnuć uwahi na § 38, dzie haworycca ab tym, što B.N.A. budzie imknucca da taho, kab fabryčnych rabotnikaŭ rabić „ułaśnikami fabrykaŭ“, — zrazumieła, što hutarka tut ab fabrykach, hdzie rabotniki pracujuć.

Pawodle majej dumki, hetkuju farmuliroŭku treba wykinuć i zamianić inšaj. Sprawa ŭ tym, što z hramadzkaha punktu hledžańnia pieratwareńnie rabotnikaŭ u ŭłaśnikaŭ fabryk — ničoha dadatniaha nam nia daść. Budziem mieć zamiest adnaho ŭłaśnika fabryki — „X“ drabniejšych ułaśnikaŭ, katoryja abo zmarnujuć fabryku, abo pieratworacca ŭ zwyčajnych drabniejšych kapitalistaŭ, jakija taksama buduć eksploatawać čužuju rabočuju siłu, biez jakoj nie abyjducca i z jakoju nie zachočać padzialicca swajoju supolnaju ŭłasnaściaj. Naahuł, zastasawańnie hetkaha systemu, ab jakim idzie hutarka, wytwaryć stan permanentnych nieparazumieńniaŭ siarod rabotnikaŭ. Urešcie, pry razhladzie hetaha pytańnia treba ŭziać pad uwahu, što sučasnaja ekanamičnaja nawuka, jak h. zw. buržuaznaja, tak i sacyjalistyčnaja, wykazałasia praciŭ pieradačy fabrykaŭ na ŭłasnaść rabotnikaŭ.

Pry ŭmowach isnawańnia instytutu prywatnaj ułasnaści (jaki zhodna z prahramaj zachoŭwajecca) najlepšaju formaju pałapšeńnia bytu rabotnikaŭ było-b dapuščeńnie ich da ŭdziełu ŭ dachodach z pradpryjemstwa. Uziaŭšy ŭsio heta pad uwahu § 36 možna było-b sfarmulirawać hetak:

„B N.A. imkniecca da taho, kab nie proletaryzawać hramadzian, ale nadzialać ich ułasnaściaj: sialanskich rabotnikaŭ nadzialać ziamloj, a fabryčnyja kab atrymliwali časć dachodu z pradpryjemstwa, a tak-ža imknucca da taho, kab i fabryčnych rabotnikaŭ nadzialać ziamloj, dzie-b jany mahli mieć prynamsia harod i pabudawać sabie chatu“. Fryjaciel.

Da Čytačoŭ „Biełaruskaj Krynicy“.

HRAMADZIANIE!

„Biełaruskaja Krynica“ wydajecca koštam składak i achwiaraŭ jaje čytačoŭ. Składka: na hod 4 zł., na paŭhodu 2 zł. i na try miesiacy 1 zł.

Wydawiectwa „Bieł. Krynicy“, dziela pašyreńnia i pahłybleńnia ŭ biełaruskich narodnych masach nacyjanalnaj, socyjalnaj i palityčnaj świedamaści, mnohim čytačom, jakija prasili, wysyłaje hazetu na pawier. Wośža **prosim** usich zadoŭžanych našamu wydawiectwu za „Bieł. Krynicu“ urehulawać daŭhi—apłacić naležnaść.

Pry hetym wydawiectwa „Bieł. Krynicy“ zaklikaje Pawažanych Čytačoŭ zaachwočywać swaich susiedziaŭ, swajakoŭ i znajomych wypisywać „Bieł. Krynicu“, wysyłajučy za hazetu składku.

Pierasyłać hrošy treba na hetki adras: **„Biełaruskaja Krynica“, Wilno, ul. Zawalna 1.**

Wydawiectwa „Bieł. Krynicy“

З БЕЛАРУСКАГА ЖЫЦЬЦЯ

У 25-тыя ўгодкі сьмерці Мікалая Нікіфароўскага. Сёлета ў траўні мінула 25 гадоў ад дня сьмерці вялікага беларускага этнографа Мікалая Нікіфароўскага.

У чэсьць нябожчыка, у 25 тыя ўгодкі ягонай сьмерці, Цэнтральны Урад Беларускага Інстытуту Гаспадаркі і Культуры 30 лістапада сёлета ладзіў урачыстую Акадэмію ў Вільні. Рэфэрат на Акадэміі прачытаў грам. М. Пецюкевіч, абшырна выказваючы вялікія заслугі Нікіфароўскага для беларускага адраджэньня і для навукі агулам. Гэты рэчовы і абшырна ўнімаючы вякікую працу вялікага беларускага этнографа рэфэрат, спадзяёмся, што прэлегент не затрымае ў сябе, але апублікуе яго друкам. Рэфэрат грам. Пецюкевіча шырака знаёміць з навуковай працай Нікіфароўскага — гэтага найбольшага беларускага этнографа.

Пасьля рэфэрату на Акадэміі хор Бел. Інстытуту Гасп. і Культуры прапяяў некалькі прыгожых беларускіх народных песьняў.

Акадэмія гэта шырока пазнаёміла ўчасьнікаў — віленскіх беларусаў з працай Нікіфароўскага, які нагрымадзіў гэтулькі багацьця ў скарбніцу навукі аб Беларусах, і які з пылу мінуўшчыны адкопываў характэрныя рысы беларускай душы і паказаў усяму сьвету ў сьвятле навукі праўдзівае аблічча Беларускага народу.

З дзейнасьці Бел. Інст. Гасп. і Культуры. У мінулую нядзелю 8 г. м. у Віленскім аддзеле Б.І.Г.іК. д-р Малецкі прачытаў II часьць свайго рэфэрату на тэму „Мы і наша Бацькаўшчына", I часьць якога была прачытана 24 лістапада ў гэтым-жа адзеле Б.І.Г.іК.

Гурток Б.І.Г.іК. у Беластоку забаронены. Апошнімі часамі заснаваўся ў Беластоку гурток Бел. Інстытуту Гасп. і Культуры і закладчыкі яго падалі аб гэтым да ведама дзяржаўна - адміністрацыйнай улады. Першая інстанцыя гэтай улады (старaства) прыняць да ведама заснаваньне гуртка Б.І.Г.іК. у Беластоку адмовілася і тымсамым яго забараніла. Закладчыкі падалі ў гэтай справе рэкурс у ваяводзтва.

Замест крытыкі — суд. У мінулую нядзелю дня 8-га сьнежня ў Т ве Прыяцеляў Белярусаведы адбыўся „крытычны" разбор повесьці В. Адважнага — „Chłapiec". Галоўным справаздаўцам быў грам. Хв. Ільляшэвіч, які не пакінуў „сухой ніткі" на аўтары „Chłapca," прызнаючы повесьці толькі „вартасьць прапагандную." Паскольку ў ацэнцы галоўнага рэфэрэнта былі захаваны йшчэ формы, пастолькі ўчасьнікі „дыскусіі" мясцамі трацілі зусім і гэту меру: з прадбачанай «крытыкі" атрымаўся завочны суд. А гэтага аўтар „Chłapca" ўсё-ж не заслужыў.

Крытыка — рэч добрая, але мусіць быць усестароньняй. Асабліва гэта важна на грунце беларусаведы, дзе ў праціўным выпадку з беларусаведы можа стацца беларусаеда. А гэтага трэба сьцерагчыся!

Стан здароўя інж. Л. Дубейкаўскага. Ведамы і заслужаны беларускі дзеяч грам. інж. Л. Дубейкаўскі пяты тыдзень ужо як занядужаў на працяжную грыпу і з наказу лекараў змушаны не пакідаць пасьцелі. Вестка гэта сярод віленскага грамадзянства выклікала занепакаеньне. Вось-жа зацікаўленых можам успакоіць, што Паважаны Пацыент ужо папраўляецца. Жадаем Яму хуткага павароту да плоднай працы!

М. Машара ў Вільні. Надовячы быў у Вільні адзін з лепшых беларускіх паэтаў Зах. Беларусі Міхась Машара. Выехаў з Вільні ў родную вёску Таболы (каля Шаркаўшчыны) дня 10-га г. м.

З Беластоку. У н-ры 45 „Б. Кр." мы падалі вестку, што маемасьць зьліквідаванага аддзелу Т-ва Бел. Школы ў Беластоку старaства перадала ў „Dom Prawosławnych Polaków". Цяпер атрымліваем вестку, што старaства зажадала звароту беларускіх кніжак назад у старaства, што і было зроблена; уся-ж іншая маемасьць асталася ў „Domie". Пытаньне, чаму гэтак руплівa старaства заапекавалася беларускімі кніжкамі?

„Калосься", беларускага літаратурна - навуковага квартальніка, кн. 4 я ўжо хутка, бо перад Калядамі, выйдзе з друку. Прэнумэрата: у год 4 зл., паўгода — 2 зл. Асобная кніжыца каштуе 1 зл. Выпісывайце і чытайце! Адрас рэд. і адм.: Вільня, Завальная 1—2.

„Беларускай Крыніцы" сьвяточны нумар выйдзе з датай 25 сьнежня 1935 г.

„Маладая Беларусь". Польская газэта „Poprostu" падае, што пасьля новага году пачне ў Вільні выходзіць новы часапіс, пад назовам „Маладая Беларусь". Часапіс гэты мае быць літаратурна-грамадзканавуковы. Зусім тое знача, што і ведамы ўжо часапіс „Калосьсе".

З гэтага відаць, што „Маладая Беларусь" будзе конкураваць з часапісам „Калосьсе" і хіба-ж дзеля гэтага толькі „М. Б." і будзе выходзіць, бо другой „патрэбы", пакульшто, ня чуваць і ня відаць. Словам, гэта нішто іншае, як разьбіваньне адзінага фронту беларускіх пісьменьнікаў Зах. Беларусі, якія пачалі гуртавацца каля часапісу „Калосьсе". І гэта ў той час, калі пісьменьнікі польскія і іншых краёў арганізуюцца ў супольны фронт супроць узрастаючага фашызму... Некаму аднак, відаць, залежыць, каб беларусаў стала разьбіваць.

Культурная праца. — Т—ва „Беларуская Хатка" у Коўне нядаўна наладзіла беларускую вечарыну — прадстаўленьне. У праграму ўходзілі дзьве п'есы: „Пасланец" і „Зьбянтэжаны Саўка."

— 19-га кастрычніка беларуская вячэрняя пачаткавая школа ў Рызе ладзіла публічную вечарыну. У праграме... латвійская п'еса, бо беларускай нельга было правясьці з прычын „фармальных."

— З пачаткам бягучага навучальнага году т-ва „Беларуская Хата" ў Рызе зарганізавала хор. Сьпеўкі адбываліся кожную нядзелю й кожнае сьвята. Зацікаўленьне вялікае. За кароткі час хор навучыўся сьпяваць значны лік беларускіх народных песьняў. Апрача таго, было прачытана некалькі рэфэратаў для сяброў „Б Х." — на розныя тэмы.

Зарганізаваўся і павёў ажыўленую працу жаночы гурток пры таварыстве. Кожны чацьверг сяброўкі гуртка займаліся ручной працай для т-ва, разам з тым адбываліся дыскусыі на розныя тэмы, пераважна выхаваўчыя.

Нажаль уся праца цяпер спынена загадам уладаў аб ліквідаваньні т-ва „Б. Х."—

U niadzielu 15 śniežnia 1935 hodu a 7-aj hadz. rana ŭ kaściele św. Mikałaja adbuducca

RARATY

na intencyju pracoŭnych m. Wilni.

Padčas Rarataŭ buduć śpiawacca biełaruskija relihijnyja pieśni i budzie skazana biełaruskaje kazańnie.

Na heta nabaženstwa ŭsich zaprašaje

Biełaruski Kaścielny Kamitet u Wilni.

Дамагаймося роднай школы.

(Наваградчына).

Якую дае карысьць беларусам польская школа, мы ўсе добра ведаем і аб гэтым усьцяж пішацца ў беларускіх газэтах. Аб бескарысным навучаньні беларускіх дзяцей папольску сёлета дакладна выказаў і польскі „Кур. Віл." Пасьля гэтага, нядаўна, Віленскі Школьны Куратар выявіў, што ў яго вокрузе толькі 128 тысяч дзяцей, якіх бацькаўскай мовай ёсьць мова беларуская і пры гэтым заявіў, што беларусы школы ў роднай мове не дамагаюцца.

Браты Беларусы! Гэткі пагляд на нас школьных уладаў змушае нас бараніць свой народны гонар — мы мусім паказаць і даказаць, што мы беларускай школы дамагацца не забыліся і дамагаемся цяпер; мы мусім паказаць і даказаць, што ня толькі 128-мёх тысяч дзяцей бацькаўскай мовай ёсьць мова беларуская, але амаль усіх дзяцей нашага Краю, аб якіх гаварыў Школьны Куратар.

Дзеля гэтага пішэце ў газэты карэспандэнцыі аб патрэбе беларускай школы, пішэце ў цэнтралі беларускіх арганізацыяў, каб яны выступалі прад адпаведнымі ўладамі з дамаганьнем беларускай школы. Апрача гэтага падавайце дэкляарацыі на родную беларускую школу.

Мітрафанчык.

Litoŭski zahraničny handal

Chacia jšče nia skončyŭsia hod, adnak jość užo dadzienyja, jakija pakazwajuć, jak sioleta wyhladaŭ zahraničny handal Litwy. Za 9 miesiacaŭ z Litwy zahranicu wywieziena tawaraŭ na 129 miljonaŭ litaŭ, a ŭwieziena na 112 miljonaŭ. Takim čynam Litwa atrymała 17 miljonaŭ čystaha dachodu. Hetaja suma ŭtrymała stałaść lita i dała mahčymaść zapłacić usie daŭhi.

Hałoŭny rynak litoŭskaha wywazu—Anhlija, kudy wywieziena tawaru na 51 miljonaŭ litaŭ, Sawiety — na 10 miljonaŭ, Belhija — 6 miljonaŭ, dalej iduć: Danija, Francyja, Čechachasławacyja, Šwajcaryja i Łatwija.

Aprača hetaha Litwa wywoziła swaje tawary tak-ža ŭ Estoniju i častkowa ŭ Niamieččynu.

Wincuk Adwažny 5)

Hanuliny kłapoty

ČAŚĆ II.

VI.

Była Hanna wielmi rada:
„Rada dobraja— nia zdrada,"
Za ksiandzom try dni chadziła —
Ni na krok nie adstupiła.
Ksiondz nerwowy, wielmi pyłki,
Skryčaŭ babu za pamyłki,
Što zrabiła j tut taksama:
Bo nia wiedała, hdzie krama,
Hdzie kupić značkoŭ štamplowych
Jana-ž maračak paštowych
Nakuplała poŭnu žmieniu
I pryniesła hetaj dreni...
Ksiandzu marki tyja pchaje,
Lezie ŭ wočy, nazalaje,
A ŭsio jenčyć, płača, prosić —
Nadajeła jamu dosyć!
Cełу Božy dzień ad rańnia
Z świedkaŭ ksiondz pisaŭ daznań-
[nie:
Da prysiahi ich prywodziŭ,
Pisaŭ, prawiŭ, waławodziŭ;
Rabiŭ doŭhi pratakoły,
I byŭ duža niewiasioły,
Wostry, wielmi znerwawany;
I papiery byli rwany...
Da kanca dawioŭ adnak-ža
I da Wilni pisaŭ takža.
Zrabiŭ z metrykaj, jak treba.
—„Ach, daj Boža, ksiandzu nieba!"
Kaža Hanna: rada duža,
Što woś skora ŭbačyć muža.
Paŭluka ad hetaj chwili
Na chłapca pierarabili.
Hannie dobra kaštawała;
Bo i świedkaŭ častawała;
Sama wypiła dźwie čarki;
Kaštawali tyja marki —
To paštowy, to štamplowy,
Što kuplała pośle nowy.
I pa pieršym uhaworu
Apłaciła Kansystoru.
Inšy metryki wyjmała —
Heta takža kaštawała.
Zapłaciła na astatku
Ksiandzu probašču ŭ dadatku.
Dyk, nia majučy zapasu,
Začapiła tuju kasu,
Što dahetul tak chawała —
Na darohu praznačała.
A što mieła u chuścince,
Dziedu to-ž dała haścinca:
Piraha kupiŭšy funcik,
Dwa jajki, baranak buncik.
Tyja-ž litary źličyŭšy
I u kuču ŭsie złažyŭšy,
Załatowačku biaz mała
Musić kožna kaštawała!
Woś papiera Paŭlukowa
Ŭžo była ciapier hatowa!
Stajać Wilenski piačaci,
Imia dobraje dziciaci.
Ŭsio, jak treba, słowa ŭ słowa
Było ŭpisana tałkowa:
„Syn—Paŭluk," a nie Paŭlina,
I chłapiec, a nie dziaŭčyna.

VII.

Ŭsio idzie ciapier kurjeram:
Hanna pre starym namieram
Jznoŭ da wojta, jznoŭ u hminu—
Rabić „dowid" swajmu synu.
Až u hminie nieparadki:
Wojt dwajnyja braŭ padatki,
Sakratar kruciŭ taksama —
Kułamiesy poŭna krama!
Kaša smačnaja — nia prosta:
Raschlabać nia moh Starosta.
Dyk tutejšyja pryhody
Až da pana Wajawody
Dajšli skora pa danosie.
Wojt dymisii ŭšo prosie,
Narakaje na zdaroŭje...
Adnym słowam – biezhałoŭje!
Ŭ hminnaj kasie było pusta,
Ŭ knižkach byŭ haroch z kapustaj
A kwity ležali ŭ horbie —
Taki tołk ŭ dziadoŭskaj torbie!
Štodzień inšy awantury:
Sakratar wyłazie z skury,
Kab da tołku knižki źwieźci.
A tut nowy pryjšli wieści:
Jość pryjechaŭšy čynoŭnik,
(Wizytatar, ci pałkoŭnik?),
Da rawizii prystupić —
Z wojta siomu skuru złupić.
Ŭ tuju strašnuju hadzinu,
Jak pryjšoŭ rawizar ŭ hminu,
Jak pa knižkach staŭ kapacca,
Sakratar pačaŭ stralacca:
Bach z rawolwara, psiajucha. —
Pierastreliŭ kaniec wucha...
Wojt taksama znerwawany,
Zara byŭ aryštawany,
I pasadžany zatoje,
Što lubiŭ dabro čužoje.
A toj strašny Wizytatar
Zasieŭ ŭ hminie jak dyktatar.
Jon rawizijaj zajmaŭsia
I na hetym dobra znaŭsia.
Byŭ kaliści akušeram,
Pośle niejkim inžynieram;
Staŭ, pawodle nowaj mody,
Referentam ŭ Wajawody.
Čyn pałkoŭnika dastaŭšy
I ŭ Rawizary papaŭšy,
Hawaryŭ wysokim tonam
I byŭ strašnym Harpahonam.
Ŭ niebaśpiečnuju časinu
Pryjšła Hanna ŭ tuju hminu;
I jakraz jaje prypiorła
Jak-by smoku ŭ sama horła:
Rawizor, jak leŭ ŭ pustyni,
Panawaŭ u cełaj hmninie:
Jak u lesie, ŭ samaj huščy,
Roŭ u hminie, jak u puščy.
A Hanula, jak durnaja,
Lezie, rozumu nia maje!
Čuć nia ŭbiłasia na scenu —
Ŭ samy ruki tamu chrenu.
Ale storaž spietryŭ babu:
Skočyŭ z boku, daŭ pad skabu —
„Stoj! kudy ty"?... joj hawora:
Tut Sadoma i Hamora,
A ty leziеš, jak z prasońnia,
Ŭ heta strašnaje biazdońnie!..."
—„Što, panočku, što tut stała?"
Hanna storaža pytała.
—„My papiery z praŭdaj hodzim:
Pa wuhloch haračych chodzim,
Jość tut mudraja hałoŭka...
Nasiŭ woŭk — panieśli woŭka."
—„A hdzie wojt?" pytaje Hanna.
—„Pajšoŭ, babka, duža tanna:
Ŭ chatu baćkawu papali
Tyja, što druhich kusali."
—„A ci puściać jaho skora?"
—„Hdzie-ž ty, baba, była ŭčora?
Ciapier lezieš, nazalaješ:
Tut biada, sama ty znaješ..."
Hanna trochi pačakała,
Pośle ŭ klamku caławała.
I, jak čarki nie dapiŭšy,
Damoŭ lezie, nos spuściŭšy.
Kryŭdy ŭsie pazabywała,
Tolki ŭ dumkach paŭtarała:
„Biedna wojtawa hałoŭka:
Nasiŭ woŭk—panieśli j woŭka!..."

Чытайце і пашырайце адзіны беларускі гаспадарскі часапіс „САМАПОМАЧ"! Пробныя нумары высылаюцца бясплатна. Адрас: Red. „Samapomač", Wilnia — Wilno, Połackaja Nr. 9—4.

Francuska-anhielskija plany spynieńnia wajny ŭ Afrycy

Paławinu Abisynii addajuć Italii.

Francuskaja dyplomacyja apošnimi časami zaŭziata namahajecca, kab „pamiryć“ Anhliju z Italijaj i spynić wajnu ŭ Afrycy. U wyniku francuska-anhielskich pierehaworaŭ u hetaj sprawie, Anhlija prapanuje dla Italii hetkija warunki:

1) Uschodnija časć prawincyi Tigre z haradami Adua i Makalle addajucca Italii. Światoje miesta Aksum — italijancy addaduć Abisynii.

2) Prawincyi Ogaden, Bale i Borau — addajucca Italii.

3) Abisynija dastaje kalidor, kab mieć dostup da marskoha b erahu — da portu Assab, abo praz italijanskija kalonii, abo praz anhielskuju Somaliju.

4) Abisynija astajecca pad uładaj negusa-cara i dastaje ad Lihi Narodaŭ dapamohu dziela prawiadzieńnia reformy z učaściem Italii.

Hetyja prapazycyi maje paćwierdzić anhielski ŭrad i pradstawić ich italijanskamu dyktataru Musolini'mu, abisynskamu negusu-caru i Kamitetu 5-och Lihi Narodaŭ.

Kali Musolini na hetyja prapazycyi zhodzicca, dyk prystupiać usie razam da zakrapleńnia padziełu Abisynii i wajna budzie spyniena. Negus Abisynii, peŭnie-ž, na heta zhody nia daść. Ale ad jaho hetkaj zhody i nia treba — jaho ŭ hetaj sprawie i anhielcy nia pytajucca.

Takim čynam „pryjacieli“ i niepryjacieli ŭžo dzielać Abisyniju i Italija dastaje paławinu abisynskaj terytoryi — z 350.000 kw. mil celaje Abisynii Italija dastaje 150.000 kw. mil.

Słowam Italija wajnu pakulšto wyjhrała.

Abisynija prad unutranaj rewalucyjaj.

Amerykanskija karespandenty ŭ Abisynii spaściarahajuć, što carstwa negusa znachodzicca pad pahrozaj unutranaj rewalucyi. Unutranyja sprawy pawadyroŭ plamionaŭ pahrażajuć razwałam Abisynii horš, čymś italijanskaja armija.

Słowam, u Afrycy pačynajecca nowaja era — pačynajecca rewalucyjnaje chwalawańnie. Ci italijanska-anhielski mir utrymaje tam rewalucyjnyja chwali — pakaža budučynia.

Pahroza wajny na Dalokim Uschodzie

My pisali, što Japonija ŭ Kitaju prawodzić swaju palityku, razdrablajučy Kitaj na aŭtanomnyja častki. Japonija baicca nacyjanalnaha ŭświedamleńnia Kitaju, dyk dziela hetaha prawodzić tam palityku razdrableńnia na aŭtanomii.

Pradstaŭnik Kitaju ŭ Żenewie minister Hoo-Chi Tsaj zajawiŭ pradstaŭnikom presy, što wajna na Dalokim Uschodzie niaminuča — Japonija moža napaść na Kitaj u kożnuju chwilinu, kali kitajski ŭrad spraciwicca japonskaj palitycy ŭ Kitaju. Liha Narodaŭ biazsilnaja, kab pamahčy Kitaju zmahacca procіŭ Japonii.

Japoncy wykazwajuć niezdawoleńnie.

Japonskaje wojska zajšoŭšy až pad Pekin trebuje ad kitajskich uładaŭ tolerancyi aŭtanomnaha ruchu ŭ zaniatych kitajskich prawincyjach. Kali kitajskija ŭłady pastawilisia da aŭtanomnaha tam ruchu niaprychilna, dyk pradstaŭnik japonskaj zbrojnaj siły zajawiŭ, što adnosiny kitajskich uładaŭ spryčynili napruźańnie ŭ kitajska-japonskich suadnosinach i paśla hetaha pasłaŭ ultymatyŭnaje trebawańnie kitajskamu ŭradu, dyktujučy jamu unutranyja źmieny i raspaiadżeńni.

Pastupki japoncaŭ adnosna Kitaju sapraŭdy „azijackija“ — unutry Kitaju raspaiadżajucca, jak u siabie doma i trebujuć, kab ichniuju rabotu rabili sami kitajskija ŭłady.

Kitajski Turkiestan pad upływam Sawietaŭ.

Sawiety, pakryŭdżanyja ŭ Mandżuryi, imknucca apanawać kitajski Turkiestan. Hety wializarny kraj, u try razy bolšy za Francyju, pastupowa padpadaje pad upływy Sawietaŭ i mahčyma, što budzie tam zawiedzieny balšawicki ład dy abwieščana sawieckaja respublika, pad pratektaratam S.S.R.R. Užo ciapier balšawiki robiać u Turkiestanie toje, što japoncy ŭ wakolicach Pekinu, — raźmiaścili swajo wojska i dyktujuć swaje ŭpływy miascowym uładam.

Heta pakazwaje, što kitajski Turkiestan faktyčna ŭžo adarwany ad Kitaju i pačynaje ŭwachodzić u palityčnuju systemu S.S.R.R.

Z wyšej apisanaha bačym, što wialiki Kitaj pačynajuć raźbirać z adnaho boku Japonija, a z druhoha sawieckaja Rasieja. Apošniaj, adnak, z pryčyny pastupowaj ekspansii ŭ Kitaju Japonii, pałažeńnie ŭ Azii stanowicca što raz hraźniejšaje i mahčyma, što Japonija ŭ swaim razhonie paćnie wyciskać rasiejskija ŭpływy z Azii zusim. Słowam, pahroza wajny na Dalokim uschodzie nia źnikaje.

Konferencyja bałtyckich dziaržaŭ

U Ryzie pačałasia konferencyja bałtyckich dziaržaŭ — Litwy, Łatwii i Estonii. Pradstaŭniki hetych dziaržaŭ 10 h. m. złažyli aficyjalnyja wizyty łatwijskamu ŭradu i ŭstanawili paradak dnia naradaŭ.

Hazety padajuć, što hałoŭnym punktam hetaj konferencyi źjaŭlajecca dašledawańnie sučasnaha mižnarodnaha pałažeńnia i ŭstanaŭleńnie šlachoŭ palityki hetych troch bałtyckich dziaržaŭ.

Damahańni ukrainskich pasłoŭ u polskim Sojmie

Na pasiedžańni Sojmu, u dyskusii nad budžetnym preliminaram, staršynia Ukrainskaha Pasolskaha Klubu pasoł W. Mudryj skazaŭ pramowu, u jakoj pradstawiŭ postulaty swajho Klubu. Spačatku pramoŭca pradstawiŭ pałažeńnie Ukraincaŭ u pieršych hadoch niezaležnaści Polščy, kali polskaja palityka suproć ukraincaŭ imknułasia, „kab 6 ščmiljonny ukrainski narod wynaradawić. Ukrainskaje hramadzianstwa, kazaŭ pasoł Mudryj, reahawała procіŭ hetkaj polskaj palityki ŭ ramach lehalnych sposabaŭ, a krajnija elementy ŭžywali aktaŭ teroru. Dyk asnowaj sužyćcia abodwych narodaŭ nia moža być niepryznawańnie i nienawiść. Treba imknucca da taho, kab hetaje sužyćcio naprawić.

Ukrainskaja parlamenckaja reprezentacyja zmahajecca za prawa na žyćcio dla usiaho ukrainskaha narodu. Ukrainskija pasły ŭwajšli ŭ polski parlament na padstawie wybarnaha kampramisu nia dziela mandataŭ, ale dziela naprawy ukrainska-polskich suadnosinaŭ.

Haworačy ab damahańniach ukrainskaha nasielnictwa, pramoŭca pastawiŭ damahańni:

zrealizawańnia poŭnaj aŭtanomii, dapuščeńnia ukrainskaj mowy ŭ urady i sudy, załażeńnia ukrainskaha uniwersytetu, dapuščeńnia ukraincaŭ u ŭrady i sudy, unarmawańnie ziamielnaj parcelacyi, amnestyi dla palityčnych wiaźniaŭ, skasawańnia łahieru adasableńnia ŭ Berezie Kartuskaj.

Heta damahańni taje častki ukraincaŭ — UNDO, — jakaja zaklučyła z pradstaŭnikami polskaha ŭradu ŭhodu, i na padstawie hetaj uhody pajšła na wybary i ciapier stawić swaje damahańni ŭ Sojmie.

Wialiki palityčny praces u Waršawie

Užo čaćwiorty tydzień adbywajecca ŭ Waršawie wialiki palityčny praces — sudziać ukraincaŭ zapadozranych u prynaležnaści da terorystaŭ OUN i abwinawačanych u zabojstwie min. Pieracкaha.

Sud užo dapytaŭ kala sotni świedkaŭ. Astałosia jašče dapraŝywać bolš 50 świedkaŭ. Praces pawinien končycca da 22 h. m., a kali nia končycca, dyk raspraшa na kaladnyja światy budzie prarwana na 10 dzion.

Z Sojmu

Miljard i 140 miljonaŭ zł. deficytu

U Sojmie pačalisia plenarnyja pasiedžańni. Paśla ŭstupnych farmalnaściaŭ i pračytańnia budžetnaha preliminaru na 1936-37 hod, wicepremjer, minister skarbu Kwiatkoŭski skazaŭ pramowu, u jakoj adznačyŭ, što ŭ polskaj haspadarčaj palitycy nia było inšaha wychadu, jak tolki nałažyć na nasielnictwa wialikija ciažary. Heta było nieabchodnaje, kab zroŭnaważyć dziaržaŭny budžet. Budžetnyja deficyty dawiali kraj da niemahčymaści azdaraŭleńnia haspadarčaha žyćcia. Ahulnaja suma deficytu za apošnija piać hadoŭ dajšła da 1 miljarda 140 miljonaŭ zł.

Amnestyja

Rada Ministraŭ u Waršawie pryniała prajekt zakonu amnestyi, jaki padany ŭžo ŭ Sojm dziela pryniaćcia jaho, jak zakonu. Prajekt hety haworyć asobna ab prastupstwach palityčnych i asobna ab prastupstwach kryminalnych.

Za prastupstwy palityčnyja hety prajekt amnestyi pradbačyć darawańnie kary: da 2 hadoŭ zusim, ad 2 da 5 hadoŭ źmianšeńnie na paławinu, ad 5—10 hadoŭ — źmianšeńnie na tracinu.

Za prastupstwy kryminalnyja: da 6 miesiacaŭ kara darоŭwajecca zusim, da 3 hadoŭ — na paławinu, ad 3 da 5 hadoŭ — źmienšycca na tracinu.

Amnestyja maje abyjmać prastupstwy dakananyja prad 11 listapada 1935 h.

Roznyja wiestki

Z POLŠČY

Budžet dla Prawasłaŭnaj Carkwy. Dziaržaŭny budžetny preliminar na 1936 37 h. dla Prawasłaŭnaj Carkwy ŭ Polščy pradbačyć hetkija sumy: na dotacyi asabowyja — 1,053,600 zł., wydatki na abstanoŭku carkoŭnych ustanoŭ — 130 000 zł., dapamohi i stypendyi — 120 000 zł., budaŭlany fond — 30.000 zł.

Na ŭtrymańni dziaržaŭnaha skarbu, zhodna z etatami, jość 2.920 asob carkoŭnaj administracyi.

Antysemityzm. Żydoŭskaje telehrafičnaje ahienstwa padaje, što ŭ Katowicach i ŭ wakolicach byli sabatažnyja akty procіŭ żydoŭskaj majemaści, pierawažna wybuchowymi materjałami. U Katowicach źniščana brama synagogi.

Biezraboćcie. Statystyka padaje: ad 15 da 30 listapada siol. zarejestrawana ŭ Polščy 308,888 biezrabotnych. Biezrabotnych raptam prybyło na 26,304 asoby.

Kanhres „Stronnictwa Ludowego“. Sialanskija partyi ŭ Polščy pačynajuć ažyŭlacca. Nadowiačy sabraŭsia Kanhres „Stronnictwa Ludowego“, na jaki prybyło 450 pradstaŭnikoŭ. Kanhres wybraŭ Radu partyi — 100 asob, jakaja radzić ab sprawach swajej dziejnaści. Hazety pišuć, što polskija „chłopskija“ partyi imknucca da zarhanizawańnia adzinaha frontu.

Z ZAHRANICY

Niaŭdałaja sproba pierawarotu ŭ Estonii. Hazety padajuć: Estonskija ŭłady wykryli tajny zahawor, jaki mieŭ zrabić dziaržaŭny pierawarot u Estonii. Aryštawana 20 asob — aficeraŭ i pawadyroŭ apazycyjnych partyjaŭ. Zahaworščykaŭ budzie sudzić wajenny sud.

Sawiety zbrojacca. Hazety pišuć, što Rada Narodnych Kamisaraŭ pastanawiła pabolšyć wajenny budžet SSRR u 1936-37 h. na paŭmiljarda rubloŭ. Sioleta balšawicki wajenny budžet maje paŭtara miljarda rubloŭ, a na budučy hod maje mieć dwa miljardy rub.

Italijancy zbambardawali abisynski horad Desie. Nadowiačy italijancy napali na aeraplanach na abisynski horad Desie i zbambardawali jaho. U toj čas byŭ tam abisynski negus—car, jaki wyjšaŭ z hetaha napadu ščaśliwa. Italijancy kidali bomby na ŭwieś horad, nie ščadzili i špitalaŭ, dzie lažali ranienyja i chworyja. Mnoha ludziej pabili, a jašče bolš paranili.

Biezraboćcie ŭ Eŭropie. Mižnarodnaje Biuro Pracy padaje, što ŭ Eŭropie jość 7,186,000 zarejestrawanych biezrabotnych. Anhlija maje — 1,948,000, Niamieččyna — 1,800,000, Italija—628,000, Hišpanija—580,000, Čechasławaččyna — 556,000, Francyja — 416,000, Halandyja — 337,000, Polšč — 306,000, Aŭstryja — 303,000, Danija—68.000, Šwajcaryja — 67,000, Madziarščyna — 46.000, Šwecyja — 43,000, Baŭharyja — 34,000, Norwehija — 28,000, Juhasławija — 12,000, Rumynija — 12,000, Łatwija — 2,000.

U paraŭnańni z prošłym hodam biezraboćcie źmienšyłasia: u Anhlii na 8,8 prac., u Niamieččynie na 25,8 prac., Italii — 27,6 prac., Čechasławaččynie — 2,8 prac., Aŭstryi — 10,3 prac., Danii — 9,3 prac., Šwecyi — 50 prac., Rumynii 4 prac.

Biezraboćcie ŭzrasło: u Hišpanii na 11,3 prac., Francyi — 16,2 prac., Halandyi — 13,1 prac., Polščy — 3,7 prac., Šwajcaryi — 30 prac., Madziarščynie — 1,1 prac., Baŭharyi — 36 prac., Norwehii — 3,6 prac., Juhasławii—10 prac., Łatwii—120 prac.

Prezydent T. G. Masaryk jašče nia ŭstupiŭ. Padadzienaja nami ŭ apošnim numary „B. Krynicy“ wiestka ab ustupleńni prezydenta Čechasławaččyny akazałasia pradčasnaj: prezydent uradu je dalej. U pierahaworach ab kandydacie na pasad prezydenta, apraća nazwanaha ministra D-ra E. Beneša, uspaminajecca jšče staršynia Čechasławackaj Narodnaj Rady praf. Dr. Nemec.

Z KRAJU.

U Horadni. Hazety padali wiestku, što chutka maje być razabrana pryhožaja carkwa św. Aleksandra, jakaja pabudawana ŭ 1870 h.

Świaščeńnik hetaj carkwy A. Pawlikowski pačaŭ arhanizawać u Horadni tawarystwa „Polski Prawosławny Dom króla S. Batorego“.

Pažar na Pinskim bałocie. Nadowiačy na bałotach u wakolicach Stolina, Łuninca i Pinska byŭ wialiki pažar — pa bałocie bušawała mora ahniu — hareła suchaja trawa. Na abšary niekalki dziesiatkaŭ kilametraŭ pahareli usie stahi siena.

Wysielenyja litoŭcy. „Vilr. Rytojus“ z dnia 7 XII siol. h. padaje, što sioleta z Świancianskaha i Brasłaŭskaha paw. polskija administracyjnyja ŭłady ŭžo wysielili niekulki świedamych litoŭcaŭ z miesca ich pachodžańnie, dazwalajučy im žyć 30 klm. ad polska-litoŭskaj administracyjnaj linii.

Naša pošta

Kackiel. Atrymali, dziakujem, skarystajem. My swaim karespandentam kožny hod robim prezent knižak — pa Kaladach razam z usimi wyšlem i dla Was hetki prezent.

Mikita z Wierawič. Piśmo atrymali, dziakujem za pamiać. Z piśma nie skarystajem, bo ab tej sprawie ŭžo pisali ŭ papiarednich numaroch „B. Krynicy“.

Mak. Karespandencyju atrymali, dziakujem, razhledzim i skaraciŭšy nadrukujem. Pišycie bolš.

Łoś. Piśmo atrymali, za karespandencyju dziakujem, skarystajem. Padpisywacca na kožnaj karespandencyi niekanlešna. Wieršy pasyłajcie ŭ „Šlach Moładzi“ — možna pierasyłać u adnym kanwercie i tudy i da nas.

Dolski Za prysłanaje dziakujem — Wašyja spaściarohi trafnyja, źwierniem i my na heta ŭwahu. Pišycie da nas čaściej.

Грамадзяне пасьпяшайцеся з купляй

Беларускага Адрыўнога Календара на 1936 год,

бо пасьля можа не стаць.

Бел. Адрыўны Календар на 1936 г. выданы на добрай сатынаванай паперы з прыгожай вокладкай.

Зьмест календара багаты і разнавіты.—Многа добрых парадаў.—Два стылі: новы і стары. Зьмены м-ца.

Купіць можна ўсюды.

Цана аднаго экзэмпляра 50 грошаў. Хто адразу купляе ад 10 да 25 календароў, плаціць 40 гр., ад 25 да 100 календ.—плаціць 37гр.,100-300—35 гр., 300—1000—33 гр.за штуку.

Галоўны склад: Беларуская Кнігарня „П А Г О Н Я“: Вільня, Завальная вуліца № 1—1.

№8(19). СТУДЭНЦКАЯ ТРЫБУНА. 15.XII.35.

Студэнцкае сьвята

Першага сьнежня сёлета адбылося вялікае сьвята беларускай студэнцкай моладзі—15годьдзе існаваньня Беларускага Студэнцкага Саюзу ў Вільні. У унівэрсытэцкай залі Сьнядэцкіх амаль не пачуеш чужацкай мовы. Ідзе студэнцтва сьвяткаваць сваё сьвята. 15 ужо гадоў працавалі і змагаліся за сьвятую справу беларускую...

Гадзіна чацьвёртая выбівае на вежы Унівэрсытэту. Заля поўна народам да апошняга месца. Атмасфэра беларуская. На фронтоне залі зьвісаюць паважна народныя бел-чырвона-белыя сьцягі. Ёсьць іх два. Так, два, бо... на двое разьдзерта сэрца Айчыны. Над сьцягамі сымболь змаганьня і барацьбы, сымболь народнай gloryi—Пагоня. Пачынаецца акадэмія. Народу ўсьцяж прыбывае. Вось Rector Magnificus, вось пан Куратар Саюзу, вось дзеячы беларускія, і беларуская моладзь, грамадзянства, прадстаўнікі братняга студэнцтва, Украінцы і Літоўцы. На подыюм кветкі, стол і катэдра. Займае за сталом месца прэзыдыюм акадэміі. Старшыня Саюзу кал. Шчорс адчыняючы акадэмію вітае прысутных кароткай прыгожай і патрыётычнай прамовай. Пасьля адкрыцьця акадэміі чытаюцца два рэфэраты, першы інфармацыйна-справаздаўчы і другі прапрамовы—ідэолёгічны. Пачулі прысутныя падзеі і мэты беларускага студэнцтва. Вясёла і радасна. Расьце студэнцкая сям'я, а за ёю стаіць... мільяновы народ Беларусаў... Вітаюць студэнтаў вусна, выражаючы свае пажаданьні прадстаўнікі беларускіх арганізацыяў і групаў, вітаюць і дэлегаты Літоўскага і Украінскага студэнцтва. Далей калега Засім чытаець прывітаньні пісьменныя і тэлеграмы: ад б. сяброў Саюзу: Татарынавічанкі Міхаліны з Гайніна, мгр. Гаўрылічанкі з Горадні, мгр. М. Тулейкі з Наваградка, ад студэнтаў Беларусаў з Варшавы, бел. студэнтаў Латыскага унівэрсытэту з Рыгі, ад Аб'еднаньня Бел. Студ. Арганізацыяў (АБСА) у Празе, ад Саюзу Украінскіх студэнтаў „Основа" ў Данцігу, Таварыства Украінскіх Студэнтаў Палітэхнікі „Основа" з Львова, Таварыства „Рідной Школы" з Львова, сьвяшч. Камара з Пінска, а. Коўша з Ласіцы, інж. Дубейкаўскага з Вільні, ад паэты М. Машары з Таболаў, ад адв. Сьвірыда з Наваградку і інш. Громкія воплескі з залі адказалі на прывітаньні.

Радасьць павялічваецца, бо мы не адныя тут у Вільні.

Пасьля прывітаньняў старшыня кал. Шчорс дзякуе за іх прамоўцам... і абвяшчае перарыў.

Па перарыве — рэцытуецца поэма Міхася Машары „Сьмерць Кастуся Каліноўскага". Бачым змагара за свабоду, за праўду, за лепшую долю беларускага народу. Пасьля рэцытацыі хор пад кіраўніцтвам грам. Шырмы концэртуе — пяець беларускія народныя песьні.

Тут ужо сапраўды загіпнатызаваныя прысутныя. Бо й мае беларуская песьня сілу чараваньня. Гудзяць на знак удзячнасьці гр. Шырме брава, воплескі, біс-біс.

Ужо гадзіна восьмая вечарам і нажаль канчаецца роднае сьвята беларускага студэнцтва, канчаецца яно громкай песьняй „Ад веку мы спалі." Раскалыхаліся старыя муры Унівэрсытэту, шуміць песьня чыну і надзеі: —„Трэба свабоды, зямлі чалавеку, трэба навуку здабыць"!..

В. П.

Студэнцкім шляхам

(З прамовы Старшыні Бел. Студ. Саюзу, сказанай пры адкрыцьці ўрачыстай Акадэміі ў чэсьць 15-годзьдзя БСС).

...XV год існаваньня для нас і нашых папярэднікаў жывучых выключна сокамі нашае роднае вёскі і ідэяй праўды, надзеяй лепшага заўтра і працай над прысьпяшэньнем гэтага заўтра, у атмасфэры наступаў ідучых з усходу і захаду — гэта даволі доўгі працяг часу.

Калі шмат арганізацыяў акадэміцкіх, злучвом сяброў каторых была пераважна мамона, закончыла ў працягу гэтага часу сваё жыцьцё, калі паўставалі новыя, — і ізноў прападалі з кругавіду студэнцкага жыцьця — БСС, адзін амаль што ад пачатку Almae Matris Vilnensis, горда рэпрэзэнтуе свае і адначасна народныя колеры, сьмела працярабляе шлях да сьветлай будучыні. — Сяброў яго не сцэмэнтоўвае дзейнік матар'яльны, ці запэўненьне цёплага месца пасьля сканчэньня студыяў, — не прэрэгатыва лёгкага хлеба ёсьць тым фактарам, пхаючым сяброў БСС. да арганізацыйнага жыцьця, да працы на карысьць і для дабра працоўных гушчаў, з якімі цесна лучыць іх супольная доля. Не! Злучвом іх ёсьць глыбокая ідэолёгія, ёсьць высокая мэта збудзіць з векавога сна шмат міліённы народ, збудзіць у ім веру ў свае сілы, вырабіць самапашану — паказаць, кім ён ёсьць, а кім быць павінен...

Мы маем шчасьце, што праз рэшата цяперашніх нацыянальна-соцыяльных да нас адносінаў здабываем так цэннае аружжа, якім ёсьць веда...

15 гадоў ціхае, жмуднае працы паза намі, — уступаем у новую эру барацьбы за свае і свайго народу правы. — Сёньня падсумоўваючы ўсе рэзультаты нашых пятнаццацігадовых натугаў мы павінны і надалей паставіць сабе за мэту самаахвярную, ціхую, скромную працу над сабою і на карысьць нашае Бацькаўшчыны!...

Да нашых абавязкаў

Умовы жыцьця нашага сялянства вельмі цяжкія. І міма іх мы відзім вельмі пацяшаючае зьявішча: вялікі гон сялянства да асьветы, да падняцьця роднай культуры. У сувязі з гэтым, якія-ж павінна мець абавязкі да вёскі і да сялянства беларуская інтэлігэнцыя. Нязначны лік нашай інтэлігэнцыі вымагае ад яе падвоіць, патроіць, удзесяцірыць сваю актыўнасьць у кірунку працы над адраджэньнем беларускага народу. Зазвычай нашая інтэлігэнцыя апраўдывае сваю бяздзейнасьць тым, што існуюць благія варункі, якія проста не даюць магчымасьці вясьці якой-бы то ня было працы. Гэта не апраўданьне. Няма такіх умоваў, якіяб не давалі ніякіх магчымасьцяў працаваць на карысьць свайго народу і Бацькаўшчыны. Пры добрай волі і ахвоце і адданасьці для ідэі нават у даных варунках можна праводзіць работу, неабходную для адраджэньня нашага народу.

М. З.

Усяму беларускаму Студэнцтву з нагоды Калядніх Сьвят і Новага Году складаем шчырыя прывітаньні і найлепшыя жаданьні гэныя сьвяты весела, радасна і карысна для сябе і беларускай справы правесьці.

Рэдакцыйная Калегія „Ст. Трыбуны."

Супроць хлусьні і даносаў...

Ідэя беларускага адраджэньня, вызвольныя імкненьні беларускага народу, яго аспірацыі палітычнае незалежнасьці, беларушчына агулам — вось што трывожыць розны масьці і колераў ворагаў беларускага народу. І праца беларускага студэнцтва, у якой-бы канкрэтнай форме яна не праяўлялася, але якая накіравана на асягненьне успомненых ідэалаў беларускага народу — выклікае злосьць і бязсільную рэакцыю тых ці іншых ворагаў.

* * *

У апошнім з дня 11.XII.35 г. нумары „Tygodnika Akademickiego," органу „Myśli Mocarstwowej" (глядзі нумар 340 віленскага абшарніцкага манархістычнага „Słowa") зьмешчаны артыкул А. Стшалкоўскага (пабеларуску Стралкоўскага) і Я. Пётровскага (пабеларуску Пятроўскага), будучыя свайго роду адказам на мой артыкул „Студэнты Палякі аб Беларусах," зьмешчаны ў папярэднім нумары „Студ. Трыбуны."

Маладыя моцарствоўцы—Стралкоўскі і Пятроўскі — пранікнутыя наскрось нацыяналістычным чадам б'юць на алярм, пры гэтым не саромяцца тасаваць мэтоду даносаў... Што ж іх забалела? У чым справа? — Бачыце, гэтых моцарствоўцаў — гневіць факт консолідацыі беларускага студэнцтва на грунце ідэі незалежнасьці Беларусі, факт супрацоўніцтва беларускага студэнцтва з студэнцтвам літоўскім і ўкраінскім (асабліва на грунце віленскага унівэрсытэту), факт і пляны позытыўнай, прадусім культурна-асьветнай, працы беларускай студэнцкай моладзі на вёсцы, сярод шырокіх беларускіх народных гушчаў, і т. п.

Стралкоўскі — цынічна ў тоне дэмагогічным у сувязі з плянамі позытыўнай працы беларускага студэнта на роднай беларускай вёсцы — крыкліва кажа: „My drzemy koty z endecją, z socjalistami, — a oni (Беларусы—А. Д) tam za naszemi plecami organizują „hurtki" w wioskach rodzinnych, mają odczyty o historji i geografji ojczystej i budzą niechęć do Polski wsród ciemnego ludu."

Уся праца беларускага студэнцтва на вёсцы, паводле Стралкоўскага, накіравана „dla celów demagogji, dla celów rozbijania wewrętrzej spoistości i całości Rzeczypospolitej!" Ня буду цытаваць балей яўнай ілжы і дэмагогіі Стралкоўскага. Зацытаванае гавора аб аўтары і яго інтэнцыях даволі ярка. Дзівіць мяне канчатак ягонага артыкулу яўна неконсэквэнтны, але вартасны дзеля таго, што паказывае гіпокрызыю Стралкоўскага. Стралкоўскі кажа ў канцы артыкулу: „Ideja narodowościowa nie powinna pozostać czczem hasłem, szanujemy bowiem solidarrą współpracę wszystkich narodowości w ramach Państwa Polskiego" Пытаю, ці да твару вам, пане Стралкоўскі, гэты сказ?!..

У іншым месцы гэтага нумару „Tyg. Akad." забірае голас і ўсправе беларускай Я. Пятроўскі. Полемізуючы са мной, чуць шабляй не памахівае. Ня буду яму адказываць. Сказанае аб Стралкоўскім адносіцца і да Пятроўскага. Ambo meliores...

Нас дзівіць нэгатыўнае становішча большасьці польскай акадэміцкай моладзі да беларускага адраджэнска-вызвольнага руху. Дзівіць яно дзеля таго, што польская моладзь польскае грамадзянства, польскія афіцыяльныя і неафіцыяльныя дзейнікі ў большасьці здаецца ведаюць аб пакутным, крывавым паднявольным шляху польскага народу..., здаецца на вуснах у іх прыгожыя гістарычныя лёзунгі... вольнасьці і роўнасьці, якімі рэкомэндуюцца.

Але-ж сапраўднасьць?!...

* * *

А міма ўсяго, беларуская вызвольна-адраджэнская думка расьце і разьвіваецца!... Адам Дасюкевіч.

Беларусы на сёлетнім кангрэсе CIE

CIE — гэта Міжнародная Студэнцкая Конфэдэрацыя, куды належаць і беларусы праз сваю цэнтралю АБСА — Аб'еднаньне Беларускіх Студэнцкіх Арганізацый у Празе. На сёлетнім кангрэсе CIE, які адбыўся ў Празе Чэскай, беларуская дэлегацыя складалася з кал. кал.: А. Вітушкі, Т. Грыба і В. Русака. Беларуская дэлегацыя прыймала ў кангрэсе дзейнае ўчасьце. Апрача таго ў рамах кангрэсу заначылася ідэовае зьбліжэньне студэнцтва балтыцка-чарнаморскага блёку, у склад якога ўходзілі прадстаўнікі студэнцтва беларускага, латыскага, літоўскага і ўкраінскага.

На запытаньне і дамаганьне беларускай дэлегацыі, прадстаўнікі студэнцтва латыскага і літоўскага забавязаліся, што падыймуць у сябе пытаньне аб сарганізаваньні катэдраў беларусазнаўства пры ўнівэрсытэтах у Рызе і ў Коўне.

Колькі студэнцкай моладзі на ўсім сьвеце?

Адказ на гэтае пытаньне далі амэрыканскія статыстыкі. Паводле іх на цэлым сьвеце 2.350.000 студэнтаў. З гэтай лічбы прыпадае 40 проц. на Амэрыку (USA), другое мейсца па USA займае СССР (272,125 студэнтаў), пасьля ідзе Нямеччына (138.910 студэнтаў), далей Францыя (89.940), Польшча (49.770), Італія (47,723), Англія (37,438). Найменей па сваёй колькасьці студэнтаў налічвае Аляска, бо толькі 89, нямнога мае студэнтаў таксама Ісляндыя, бо толькі 180.

Калі-ж возьмем промілёвыя адносіны колькасьці студэнтаў да насяленьня ў паасобных дзяржавах, то ізноў-жа найлепш гэтая справа прадстаўляецца у USA, дзе гэтыя адносіны выражаюцца цыфрай 7.89(promile), затым ідзе Эстонія — 2,97$^{0}/_{00}$, Румынія — 2,07$^{0}/_{00}$, Бэльгія — 1,36$^{0}/_{00}$, Англія— 0,38$^{0}/_{00}$ ..

Жанчын—студэнтак найболей у USA, бо лік іх раўняецца 40 проц. усяе унівэрсытэцкае моладзі. У Фінляндыі гэтыя адносіны выражаюцца лічбай 33,8 проц; у Польшчы—лічбай 28,6 проц.; у Румыніі— лічбай 27,9 проц., у Югаславіі—лічбай 22 проц.; у Італіі — 13,8 проц. Найболей чужой студэнцкай моладзі (34.1 проц. усіх студэнтаў Аўстрыі) вучыцца ў аўстрыяцкіх унівэрсытэтах. Другое мейсца пад гэтым поглядам займае Швайцарыя (22 проц), трэцяе Бельгія (16,1 проц.)

Найбольшую колькасьць студэнтаў, якія вучацца паза межамі свае бацькаўшчы налічае Баўгарыя, Літва і Вугоршчына.

Трэба сказаць, што нямала і беларускай студэнцкай моладзі знаходзіцца па за межамі свае Бацькаўшчыны. Цяжкія матар'яльныя і палітычныя абставіны змушалі і змушаюць беларускую моладзь шукаць асьветы на чужыне. Поўная энэргіі і веры ў лепшую будучыню беларуская студэнцкая моладзь здабывае асьвету ня толькі ў эўрапэйскіх але і пазаэўрапэйскіх унівэрсытэтах, каб пасьля, вярнуўшыся на родныя гоні, раскрыць сваім братам вочы і засяваць у іх сэрцах зярнё праўды і паказаць шлях да лепшай будучыні.

Я.

Рэдакцыйная Калегія «Студэнцкай Трыбуны» ў складзе: А. Дасюкевіч, М. Смаршчок, А. Махонька, В. Папуцэвіч і М. Канцэлярчык.

Redaktar Jan Paźniak. Biełaruskaja Drukarnia im. Fr. Skaryny ŭ Wilni, Zawalnaja 1 — 2. Wydawiec A. Šutowič